**Мацей Бутрымовіч (1745–1814), дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, падстараста і мечнік Пінскага павета**



Матэвуш (Мацей) Бутрымовіч нарадзіўся ў 1745 годзе на Ваўкавышчыне ў шляхецкай сям'і герба Топур. Быў сынам Якуба і Анастазіі. Вучыўся ў школе пры езуіцкім калегіуме ў Пінску.

Пасля заканчэння школы Мацей Бутрымовіч паступіў на ваенную службу. У 1778 годзе ён даслужыў да капітанскага звання, а потым пачаў актыўную грамадскую дзейнасць: з 1778 года ён на пасадзе канюшага, з 1780 года – мечнік, а з 1783 года – суддзя гродскі, з 1785 года – падстараста, з 1791 года – лоўчы пінскі. Атрымаўшы ў 1778 годзе ва ўласнасць Лапацінскі ўдзел, Матэвуш Бутрымовіч уладкоўваецца з сям'ёй у Пінску.

М. Бутрымовіч сыграў асобую ролю ў эканамічным развіцці цэнтральна-палескага рэгіёна, у меліярацыі, будаўніцтве і асваенні каналаў (Агінскага – 1767–1783; Каралеўскага – 1775–1783), двух буйных водных шляхоў, пракладзеных у другой палове XVIII ст. і зрабіўшых Пінск портам міжнароднага значэння. Горад атрымаў сувязь з Чорным і Балтыйскім марамі.

Матэвуш Бутрымовіч з маладосці быў сябрам і даверанай асобай гетмана Міхала Казіміра Агінскага, арандатарам многіх яго палескіх маёнткаў. Уносіў канкрэтныя прапановы пры будаўніцтве канала Агінскага. Карыстаўся распалажэннем караля, якога са світай, з найвялікшымі ўшанаваннямі (стральбой з гармат, ілюмінацыямі і аркестрам) сустракаў 8 верасня 1784 года ўздоўж свежанасыпанай у асноўным за свой рахунак першай дарогі-веславання ад прадмесця Каралін да Крысцінава. Кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ўбачанае назваў цудам і падарыў рэфарматару залатую табакерку з каштоўнымі камянямі і сваёй выявай.

Матэвуш Бутрымовіч першым сярод землеўладальнікаў Палесся прыступіў да асваення забалочаных, пераўвільгатненых і пойменных угоддзяў, затапліваемых веснавымі паводкамі. З'яўляўся непасрэдным арганізатарам і выканаўцам гэтых работ, не шкадаваў сродкаў і сіл. Праклаўшы каналы, якія дрэнажуюць, і выкарыстоўваючы ў поплаве ракі Сапры польдарную сістэму (выгаражванне ўчастка ад затаплення шляхам абвалавання), ён асвоіў лапацінскія і хлябоўскія балоты, якія належылі цесцю Якубу Лях-Шырме. У 1773 годзе сярод акультураных зямель на ўзвышэнні залажыў новую сядзібу – Крысцінава, якую так назваў у гонар сваёй жонкі Крыстыны. Парк з аранжарэяй быў спланаваны на месцы асушанага масіву.

У Лапаціне Матэвуш Бутрымовіч арганізаваў рамесную школу. Рамеснікі выраблялі замкі, рысоры, крэслы і іншыя вырабы. На рацэ Стыр працаваў млын. У 1798 годзе ствараецца суконная фабрыка. Маёнтак стаў даходным, лапацінскія сялянскія двары выдзяляліся моцнай забудовай і

дагледжанасцю.

У 1786 годзе М. Бутрымовіч – дэпутат Трыбунала Літоўскага, у 1788 годзе – пасол на чатырохгадовы сейм. За вялікія заслугі перад Айчынай быў узнагароджаны ордэнамі Святога Станіслава (1791) і Белага Арла. Ён заставаўся перакананым прыхільнікам Канстытуцыі 3 мая 1791 года. Аднак пасля новага падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 годзе і роспуску сейма дакладныя звесткі пра М. Бутрымовіча знікаюць.

Дакладныя звесткі пра дату яго смерці адсутнічаюць. Па інфармацыі Агульнай энцыклапедыі Оргельбранта, якая выйшла ў свет у Варшаве ў 1859–1868 гадах, Мацей Бутрымовіч ужо ў 1810 годзе не значыцца ў спісах жывых кавалераў ордэна Станіслава. Па іншых агульнапрынятых звестках, М. Бутрымовіч памёр яшчэ праз чатыры гады ці нават у першых днях 1815 года.

Пінчукі паважаюць і шануюць памяць пра свайго земляка. Імем Матэвуша Бутрымовіча названа вуліца ў Пінску. У вёсцы Лапаціна Пінскага раёна Брэсцкай вобласці на тэрыторыі былой сядзібы Крысцінава пастаўлены памятны знак у гонар М. Бутрымовіча. У Музеі Беларускага Палесся захоўваецца пліта, якая калісьці была ўсталявана ў гонар закладкі Крысцінава. На яе адваротным баку маецца надпіс, зроблены па заказе М. Бутрымовіча, у памяць памерлых слуг: кухара Лявона Ажахоўскага і наглядчыка стайняў Яна Кучэўскага.

Непасрэдна ў горадзе напамінам аб М. Бутрымовічу застаўся палац, які меў назву «Мур». Палац Бутрымовіча будаваўся на працягу дзесяці гадоў па праекце віленскага архітэктара К. Шыльдхаўза ў імправізаваным стылі пераходнага перыяду ад барока да класіцызму. Да 1933 года знаходзіўся ва ўласнасці Бутрымовічаў-Скірмунтаў. У палацы захоўваліся сямейныя рэліквіі, архіў, якія былі разрабаваны ў Першую сусветную вайну. Палац М. Бутрымовіча ўключаны ў Спіс аб’ектаў культурнай спадчыны арганізацыі ЮНЕСКА. У цяперашні час тут размяшчаецца экспазіцыя Музея Беларускага Палесся і аддзел ЗАГСа.

Немагчыма перабольшыць высокіх маральных якасцяў Матэвуша Бутрымовіча. Прысвяціўшы сябе служэнню роднай Піншчыне, гэты высакародны і працавіты чалавек на ўсе часы застаўся ганаровым гараджанінам Пінска.


1. **Бутрымовічы, Бутрымы** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 1996. Т. 2. – С. 360–361.
2. **Бутримовичи** // Федорук, А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук ; под ред. Т. Г. Мартыненко. Минск, 2004. – С. 28–31.
3. **Butrymoicz Mateusz** // Polski słownik biograficny / Polska akademia umiejętności. Kraków, 1937. T. III. S. 153–154.
4. **Здановіч, У.** У складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай / У. Здановіч // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск, 2003. – С. 64–65.

5. **Памятны знак у гонар М. Бутрымовіча** // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск, 2003. – С. 564
6. **Ільянкоў, В.** З Палессем звязаныя лёсы. Матэвуш Бутрымовіч / Вячаслаў Ільянкоў // Краязнаўчая газета. 2005. № 31–32. – С. 7; № 33. С. 6.
7. **Ильенков, В.** Матеуш Бутримович / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. 1997. 3 чэрвеня. (С Пинском связанные судьбы).
8. **Марголина, Р.** Матеуш Бутримович – преобразователь и гордость земли Пинской / Рита Марголина // Пінскі веснік. 1996. 4 студзеня.
9. **Палац Бутрымовіча** = Дворец Бутримовича = The Boutrimovich Palace // Хвагіна, Т. А. Пінск і яго ваколіцы : навукова-папулярнае выданне / Таццяна Аркадзьеўна Хвагіна. Мінск, 2007. – С. 82–87.
10. **Пинский дворец Бутримовича** // Туристская энциклопедия Беларуси. Минск, 2007. – С. 440.
11. **Палац Бутрымовіча.** Palac Butrymowicza. Дворец Бутримовича // Несцярук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў / Л. Н. Несцярук. Мінск, 2002. – С. 246–247.
12. **Пінскі палац** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 2001. Т. 12. – С. 373.
13. **Кулагін, А. М.** Палац Бутрымовіча / А. М. Кулагін // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Мінск, 1984. – С. 293–294.
14. **Гринь, О.** Дворец Бутримовича: поэтика повседневности / Оксана Гринь // Пінскі веснік. 2012. 12 кастрычніка.
15. **Лосич, П.** Бутримович был бы рад… // Лосич, П. Особенный день : Пинск прирастает новыми социальными объектами / Павел Лосич, Валерий Король (фото) // Заря. 2009. 30 апреля.
16. **Ильенков, В.** Семь жизней пинского «франта» : [дворец Бутримовича] / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. 2009. 24 красавіка.
17. **Сидорук, Ж.** Пинским молодоженам подарили дворец / Жанна Сидорук // Брестская газета. 2009. № 15.
18. **Солоневич, Ю.** Неподвласны времени : [реставрация дворца Бутримовича] / Юрий Солоневич // Пінскі веснік. 2008. 5 снежня.
19. **Гришковец, В.** Судьба резиденции Бутримовича и Скирмунтов / Валерий Гришковец // Заря. 2007. 22 марта
20. **Куницкий, П.** Возрождение «жемчужины Полесья» : [реставрация дворца Бутримовича] / Павел Куницкий // Вечерний Брест. 2007. 21 марта.
21. **Скороход, Ю.** От полонеза до свадебного марша : [о дворце Бутримовича] / Юрий Скороход // Полесская правда (Пинск). 2006. 21 января.
22. **Дворец Бутримовича в Пинске** [Электронный ресурс] // Режим доступа: http://pike.by/tourism/butrimovich.html

23. **Дворец Бутримовича** [Электронный ресурс] // Режим доступа: http://yan.vydra.com/brest/brest18/dvor-butrim/.
24. **Ільянкоў, В.** З Палессем звязанныя лёсы. Матэвуш Бутрымовіч// Краязн. газ. – 2005. – № 31–32 (жн.). – С. 7
25. Maciej Butrymowicz, (w:) Sejm-wielki.pl (pl)